мякка нармалізуе дзейнасць страўніка. Дзякуючы багатаму зместу танінаў, слізі і вітаміну С, ён валодае добрымі супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі пря язвавай хваробе страўніка. Асабліва карысна гэта расліна цяжарным і жанчынам, якія кормяць, а таксама грудным дзецям падчас з'яўлення зубоў.

Унікальны склад вызначае разнастайнасць гаючых уласцівасцяў "Іван-чаю". Гэта і лёгкае слабільнае, змякчальнае, болесуцешальнае дзеянне. Па сваіх супрацьзапаленчых уласцівасцях "Іван-чай" пераўзыходзіць усе лекавыя расліны – навукова даказана, што у яго самы высокі сярод раслін каэфіцыент супрацьзапаленчага дзеяння. У народнай медыцыне "Іван-чай" здаўна лічыцца таксама супрацьпухлінным сродкам.

**Спіс літаратуры:**

1. Пыльцына, Е.И. Ваш травник / Е.И.Пыльцина. – Ростов н/Д: Владис, 2004. – 672 с.

# УЛАДЗІМІР МІХАЙЛАВІЧ КОНАН – БЕЛАРУСКІ ФІЛОСАФ, ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦА

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
**Зюзькова Надзея Уладзіміраўна, 1 к., 3 гр., ЛФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Уладзімір Міхайлавіч Конан – славуты вучоны, знакавая фігура на навуковай, гуманітарнай прасторы. Яго імя ведаюць далёка за межамі Бацькаўшчыны. Праз свае шматлікія навуковыя працы ён папулярызаваў беларускую навуку, культуру, на прасторах Еўропы і Амерыкі. Адкрыў забытыя імёны нашых выдатных творцаў – вучоных, пісьменнікаў, рэлігійных дзеячаў…

Беларускі філосаф і літаратуразнавец Уладзімір Міхайлавіч Конан нарадзіўся 23 красавіка 1934 года на Навагрудчыне ў вёсцы Вераскава. У 1959 годзе скончыў БДУ, у 1959-1961 гады працаваў настаўнікам і дырэктарам Стражоўскай школы на Вілейшчыне. Выкладаў ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

З 1962 па 1990 гады Уладзімір Міхайлавіч працаваў у інстытуце філасофіі АН Беларусі, дзе з 1984 года займаў пасаду загадчыка сектара эстэтыкі і сацыяльнай псіхалогіі. З 1991 годазагадчык аддзела гісторыі і тэорыі культуры нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя



Репозиторий ГрГМУ

Ф.Скарыны. У 1962 годзе пачаў у аспірантуры Інстытута філасофіі АН БССР даследаваць тэму “Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі: 1917–1934 гг.”

У.Конан друкуецца з 1963 года і з’яўляецца аўтарам амаль 30 манаграфій і брашур, звыш тысячы навукова-даследчых артыкулаў у розных галінах гуманітарных навук.

З 2005 года вядучы навуковы супрацоўнік навукова-асветніцкага цэнтра пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Максіма Танка, з 2006 года – вядучы навуковы супрацоўнік інстытута філасофіі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Акрамя таго, з'яўляецца членам саветаў па абароне доктарскіх дысертацый Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, навуковым кансультантам шэрагу выдавецтваў і часопісаў.

У сваіх навуковых працах ён даследаваў праблемы філасофіі і культуралогіі, гісторыю эстэтычнай думкі, пытанні фалькларыстыкі і літаратуразнаўства Беларусі. У 1984 годзе атрымаў дзяржаўную прэмію Беларусі за напісанне цыкла прац па гісторыі філасофіі і грамадскай думкі.

Кола аб’ектаў даследавання Уладзіміра Конана імкліва пашыралася. Услед за крытычна-біяграфічным нарысам “Адам Бабарэка” з’явілася манаграфія “Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917–1934 гг.)”. Яна ахоплівала перыяд найбольш інтэнсіўнага развіцця не толькі эстэтычнай думкі, але і нацыянальнай беларускай ідэі. У асобнай невялікай манаграфіі “Демократнческая эстетика Белоруссии (1905–1917 гг.)” У. Конан упершыню ў савецкай навуцы прааналізаваў творы Антона Луцкевіча, Вацлава Ластоўскага і іншых “нашаніўцаў”, згадваючы адны іх псеўданімы, бо працы гэтых творцаў, чый уклад у нацыянальную культуру асабліва важкі, на той час былі забароненыя.

Менавіта філасофскі ракурс бачання духоўнай культуры, у тым ліку традыцыйнай культуры народа, даў магчымасць вучонаму напісадь адну з этапных у беларусазнаўстве кніг – “Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору” (1989). Праца гэтая, яшчэ, на жаль, належна не ацэнена спецыялістамі-народазнаўцамі, не мае аналагаў на ўсёй постсавецкай прасторы.

Сярод апошніх яго манаграфій – "Ля вытокаў самапазнання”: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору", "Боская і людская мудрасць (Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд)", "Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча". У Беларускім фондзе Культуры выйшла кніга "Погляд у вечнасць", прысвечаная юбілею навукоўца, у якой змешчаны і працы У.М.Конана. Прафесар Конан належыць да нешматлікага кола людзей, знаёмства з якімі адкрывае цэлы свет, багаты і разнастайны, напоўнены высокімі ідэаламі і духоўнымі каштоўнасцямі. Але гэты свет мае прахалоду



Рэпазіторый ГрГМУ

адзіноты – такі лёс людзей выбраных, якім, аднак, уласцівае цяпло любові да бліжніх, цярплівасць, разуменне і дараванне.

**Спіс літататуры:**

1. Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу: манаграфія / У.М. Конан. – Мінск: БДПУ, 2006. – 175 с.

2. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 8. Канто-Кулі / рэдкал. Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: Бел.Эн., 1999. – С. 399.

3. Боская і людская мудрасць: (Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд) / Уладзімір Конан. – Мінск: [б. в.], 1990. – 64 с.

4. Выбранае / Уладзімір Конан. – Мінск: Смэлтак, 2009. – 535 с. – (Выдатныя постаці Беларусі).

## УЖЫВАННЕ ТАРАШКЕВІЦЫ Ў БЕЛАРУСКІМ МАЎЛЕННІ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Матыліцкая П.А., 1 к., 14 гр., ЛФ**
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт, загадчык кафедры Сіткевіч С.А.

У літаратурнай беларускай мове існуе дзве нормы. Першая — афіцыйная, якая замацавана беларускім заканадаўствам. Але побач з ёй існуе другая норма. Яна знаходзілася ў афіцыйным ужыванні ў перыяд з 1918 па 1933 гг. і называецца класічнай (традыцыйнай) нормай, або тарашкевіцай.

Сапраўды, пасля рэформы беларускага правапісу 1933 г. беларуская граматыка, кадыфікаваная Б. А. Тарашкевічам, перастала лічыцца нарматыўнай. Але з ужывання тарашкевіца не выйшла. Ёю працягвалі карыстацца частка беларускіх палітычных арганізацый Заходняй Беларусі і беларуская дыяспара.

Прычына гэтага складалася ў тым, што змены, якія з’явіліся ў выніку рэформы, моцна скажалі ўстаноўленыя нормы літаратурнай беларускай мовы. У новастворанах правілах сустракаліся шматлікія недакладнасці, памылкі і недагляды. У беларускую мову штучна была ўведзена вялікая колькасць асаблівасцей, уласцівых рускай мове; многія правілы былі сфармуляваны на ўзор адпаведных правіл рускай мовы. Такія правілы не адпавядалі літаратурнаму вымаўленню і не пашыраліся на ўсю лексіку, што выклікала істотныя супярэчнасці. Пад назвай «рэформа правапісу» хавалася адначасова і рэформа фанетыкі, марфалогіі, лексікі і іншых раздзелаў.



Репозиторий ГрГМУ